# ДА ПЫТАННЯ
# АБ МЕТАДАХ ДАСЛЕДАВАННЯ ЖУРНАЛІСТЫКІ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле актуалізуецца праблема метадалагічнага падыходу да даследавання працэсу функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі, абумоўленая сацыяльнымі зменамі, тэндэнцыямі сучаснай навукі; прадстаўлены агляд этапаў развіцця айчыннай навуковай школы журналістыкі.

***Ключавыя словы:*** метадалогія; метадалагічны падыход; журналістыка; навуковая школа; этапы развіцця.

# TO THE QUESTION
# OF METHODS OF JOURNALISM RESEARCH

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article actualizes the problem of the methodological approach to the study of the process of functioning of the mass media, due to social changes, trends in modern science; provides an overview of the stages of development of the national scientific school of journalism.

***Key words:*** methodology; methodological approach; journalism; scientific school; stages of development.

У сучасных умовах журналісцкая дзейнасць знаходзіцца ў полі зроку як грамадства, так і навуковай супольнасці. Цікавасць абумоўлена пастаянным нарастаннем сацыяльных супярэчнасцяў, што, у сваю чаргу, выклікае неабходнасць асэнсавання вопыту. Тэарэтычныя набыткі даследавання працэсу развіцця сродкаў масавай інфармацыі ў наш час з’яўляюцца трывалым фундаментам, на якім грунтуецца як сама прафесійная дзейнасць, так і напрамкі яе трансфармацыі ў навуковым вымярэнні.

Тэарэтычную аснову любой з’явы складаюць, безумоўна, яе вызначальныя катэгорыі і паняцці. Разуменне іх сутнасці і шляхоў пасту-

пальнага развіцця дасягаецца толькі на аснове выпрацоўкі грунтоўнай метадалогіі, якая, на самай справе, і адлюстроўвае перспектывы.

Класічная тэорыя журналістыкі ў наш час валодае вялікай колькасцю спосабаў тэарэтычнага асэнсавання як рэчаіснасці, так і ўласна практычнай дзейнасці. Сукупнасць спосабаў і прыёмаў вывучэння журналістыкі як аднаго з напрамкаў сацыяльнай практыкі пастаянна папаўняецца, удасканальваецца ў залежнасці ад мэт і задач канкрэтнага перыяду. Больш таго, на сённяшні дзень даследчыкамі прапануецца дастаткова разнастайная метадалогія, што дазваляе гаварыць аб наяўнасці самой праблемы метадалогіі ў журналісцкай навуцы, праблемы выбару адпаведнага метаду.

У той жа час выпрацоўка аптымальнага метаду, накіраванага на дасягненне канкрэтных мэт, павінна грунтавацца на разуменні і пераасэнсаванні назапашанага тэарэтычнага вопыту. На самай справе, у аснове кожнага тэарэтычнага кроку аналітычны падыход, які пад уплывам розных акалічнасцяў трансфармаваўся.

Даследаванне працэсу развіцця журналістыкі пачалося ў XVIII ст. у Расіі. Так, першымі тэарэтыкамі былі М. В. Ламаносаў, М. І. Навікоў, потым, у XIX ст. – П. А. Вяземскі, В. Р. Бялінскі і інш. Першыя даследаванні мелі апісальна-разважальны характар, набліжаны да літаратурнай практыкі. Аналіз канкрэтных выданняў прадстаўлены ў гэты час у працах А. М. Скабічэўскага, М. К. Лемке, Н. А. Энгельгарта і інш. Паступова ў навуцы замацоўвася ідэалагічны падыход, абумоўлены рэвалюцыйнымі падзеямі пачатку XX ст., пазней – умацаваннем савецкай ідэалогіі.

У другой палове XX ст. у расійскай журналісцкай навуцы распрацоўваецца новая метадалогія, заснаваная на комплексным аналізе розных аспектаў дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі. Яе асноўныя палажэнні былі выкладзены ў працах А. Ф. Беражнога, Г. В. Жыркова, С. Г. Карканосенкі і многіх іншых.

У сярэдзіне XX ст. пачынае фарміравацца акадэмічная школа беларускай журналістыкі. На гэта паўплываў працэс інтэнсіўнага развіцця прафесійнай адукацыі: так, у 1932 г. быў адкрыты КІЖ – першая вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы журналістаў, у 1944 г. – факультэт журналістыкі ў БДУ.

Асноўныя метадалагічныя падыходы да вывучэння гісторыі, тэорыі і практыкі журналістыкі былі выкладзены ў працах першых беларускіх даследчыкаў, пачынальнікаў айчыннай навуковай школы: М. С. Зярніцкага («Газета “Звезда” в период подготовки и проведения Октябрьской социалистической революции в Белоруссии» (1949),

«Інфармацыя ў бальшавіцкім друку: рабочы матэрыял да праграмы “Работа над газетай”» (1934) і інш.; С. Х. Александровіча («Літаратурна-крытычныя артыкулы» (1968), «Пуцявіны роднага слова: праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст.» (1971) і інш.; С. Г. Рожына («Газета “Северо-Западный край”» (1970); Б. В. Стральцова («Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства» (1977), «Газета і мараль» (1971); Р. В. Булацкага («Первые рабселькоры Белоруссии» (1969) і інш.; С. В. Говіна («Друк Заходняй Беларусі» (1974); І. І. Сачанкі («Вайна і публіцыстыка» (1980) і інш.; А. Г. Слукі («Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці: метадалогія фарміравання» (2007), «Беларуская журналістыка: падручнік» (2011) і інш.; М. Я. Цікоцкага («З гісторыі беларускай журналістыкі» (1960), «Стылістыка беларускай мовы» (1962) і інш.; Е. Л. Бондаравай («Время, экран, критика» (1975), «Экран в разных измерениях» (1983) і інш.; Т. Д. Арловай («Введение в журналистику. Организация работы редакции газеты» (1989); «Театральная журналистика. Теория и практика», в 2 ч. (2001–2002) і інш.; С. В. Марцэлева («Печать Советской Белоруссии: исторический очерк» (1967); Н. Ц. Фральцовай («Основные тенденции развития современного телевидения Республики Беларусь» (2008) і інш.

Беларуская навуковая школа журналістыкі аб’ектыўна развівалася пад уплывам расійскай і на яе аснове фарміравала і выпрацоўвала ўласную метадалогію. Так, у даследаваннях савецкага перыяду сярод падыходаў пераважалі гістарычны, гісторыка-культуралагічны, філалагічны і інш. Першы дазваляе прадставіць заканамерны працэс у рэтраспектыве, апісаць яго дынаміку, выявіць тэндэнцыі і перспектывы. Гісторыка-культуралагічны падыход дае магчымасць трактаваць журналістыку як культурную з’яву. Акрамя таго, выкарыстанне філалагічнага падыходу прадстаўляе магчымасць атаясамліваць журналістыку з літаратурным працэсам. У канцы 1990-х гг. на факультэце журналістыкі БДУ выкладалася дысцыпліна «Гісторыя журналістыкі і літаратуры».

У пачатку 2000-х у даследаваннях актыўна выкарыстоўваецца інстытуцыянальны падыход, дзе журналістыка разглядаецца ў якасці сацыяльнага інстытута, у гэты ж час распрацоўваецца і ўдасканальваецца яе заканадаўчая база. Сістэмны падыход дае магчымасць даследаваць журналісцкія працэсы ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. Сярод сучасных метадаў перспектыўным становіцца дыскурсіўны, які дазваляе правесці ўсебаковы аналіз тэксту і яго разнастайных функцый. Запатрабаваным у наш час з’яўляюцца міждысцыплінарны падыход, які дае магчымасць праводзіць аналіз журналісцкай дзейнасці ў суадносінах з іншымі навуковымі і сацыяльнымі сферамі. Такім чынам, тэорыя

сучаснай беларускай журналістыкі грунтуецца на даследаваннях яе пачынальнікаў і ўдасканальваецца новымі падыходамі ў тэарэтычных працах.

У апошні час пры даследаванні журналістыкі найбольш распаўсюджанымі і прызнанымі можна назваць наступныя метадалагічныя падыходы: інстытуцыянальны, функцыянальны, дзейнасны, сістэмны, гістарычны, філалагічны, сацыялагічны, камунікацыйны, эмпірычны і інш. З аднаго боку, гэта сведчыць аб высокай ступені развіцця журналісцкай навукі, якая актыўна выкарыстоўвае назапашаны вопыт і найноўшыя дасягненні. З другога, наяўнасць такой колькасці падыходаў прыводзіць да высновы, што на сённяшні дзень у медыянавуцы не выпрацавана адзіная канцэпцыя аб метадах даследавання. Кожны з названых вышэй падыходаў мае даволі абмежаваны спектр выкарыстання: так, напрыклад, эмпірычны падыход можа быць карысным для аналізу асобных прыкладных аспектаў прафесійнай дзейнасці, аднак на яго аснове нельга выпрацаваць грунтоўную тэарэтычную канцэпцыю і г. д.

Такім чынам, навуковая праблема метаду для журналістыкі застаецца даволі актуальнай. У свой час яе вельмі слушна актуалізаваў прафесар Б. В. Стральцоў: «Журналістыка – гэта феномен, які выступае ў неабсяжным шматабліччы. Феномен – вызначэнне больш эмацыянальнае, чым навукова-канкрэтнае. А ці можна вызначыць глыбінную сутнасць журналістыкі больш дакладна? Відаць, можна, хоць і цяжка» [1].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Стральцоў Б. В*. Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста: вучэбны дапаможнік для студэнтаў спец. Е 23.01 08-01 «Журналістыка» / Мінск : БДУ, 2002. С. 3.